# УПЛЫЎ СТРАХУ НА АСЭНСАВАННЕ РЭЧАІСНАСЦІ МАЛОДШЫМІ ШКОЛЬНІКАМІ*

**В.У. РАГАЧОВА,**
*аспірантка кафедры педагогікі сацыякультурнай дзейнасці БДУ культуры*

Сучасная айчынная сацыякультурная прастора характарызуецца складанымі і супярэчлівымі тэндэнцыямі. Яны адлюстроўваюць працэс трансфармацыі існаваўшай на працягу многіх гадоў сістэмы культурна-асветніцкай работы ў структуру, якая бачыць сваё найвышэйшае прызначэнне ў аказанні педагагічнай, псіхалагічнай, псіхатэрапеўтычнай, сацыяльнай дапамогі людзям, што адчуваюць у гэтым патрэбу. Асабліва сказанае тычыцца дзіцяці, уваходжанне якога ў сацыяльную рэальнасць праз засваенне шматграннага чалавечага вопыту, зафіксаванага ў культуры, патрабуе моцнага напружання сіл. М. Бярдзяеў адзначаў, што дзіця з'яўляецца галоўнай каштоўнасцю і аб'ектам культуры, таму што з яго развіццём і станаўленнем звязана будучае грамадства, а культура выступае сродкам і ўмовай гэтага развіцця [1, с. 607].

Новыя стратэгічныя арыенціры ў рэфармаванні сацыяльна-культурнай сферы звязаны са зменай выхаваўча-адукацыйнай парадыгмы, прынятай у краіне, яе пераходам ад фарміруючай мадэлі выхавання асобы да развіваючай, гуманістычнай. У межах гэтай канцэпцыі асоба дзіцяці разглядаецца не толькі і не столькі як істота, што акумулюе назапашаны вопыт, колькі як асоба, здольная бачыць і ўспрымаць гуманістычны сэнс гэтага вопыту, быць здольнай да адкрыцця і глыбокага суперажывання яго зместу, падрыхтаванай да сутнаснага спасціжэння і эмацыянальнага ўспрымання культурна-гістарычных з'яў.

Відавочна, што дасягненне гэтых параметраў развіцця дзіцяці патрабуе ад сферы сацыякультурнай дзейнасці значнага пашырэння і якаснага аднаўлення сутнасці выхаваўчай работы, функцыянальнага прызначэння, зместу і накіраванасці праграм з пункту гледжання забеспячэння найбольш аптымальных умоў для індывідуальнага станаўлення кожнага чалавека. Здольнасць устаноў культуры і мастацтва комплексна ўздзейнічаць на інтэлектуальную, валявую і асабліва эмацыянальную сферы асобы дзіцяці робяць цэнтры эстэтычнага выхавання дзяцей і моладзі незаменнымі ў працэсе цэласнага засваення імі навакольнага свету і гарманічнага развіцця самой асобы.

Эмацыянальныя працэсы неаддзельныя ад разумовых, практычных дзеянняў асобы. Эмоцыі, пачуцці, перажыванні выступаюць важнымі старонкамі паўнацэннага чалавечага існавання. Іх неразвітасць, абмежаванасць негатыўна ўплываюць на жыццядзейнасць асобы, характар яе ўзаемаадносін са светам і грамадствам, з самім сабой.

Парушэнне гарманічнага ўзаемадзеяння ўсёй палітры эмоцый чалавека, дамінаванне адной з іх таксама з'яўляецца негатыўным фактарам у яго развіцці. Адной з такіх эмоцый, якая значна ўплывае на працэс развіцця малодшага школьніка, з'яўляецца эмоцыя страху.

У працэсе развіцця малодшага школьніка страх, як даволі моцная эмоцыя, можа значна ўплываць на паводзіны і перцэпцыйна-кагнітыўныя працэсы

*Артыкул рэкамендавала Я.Д. Грыгаровіч, доктар педагагічных навук, прафесар.

(працэсы ўспрымання і пазнання). Калі дзіця адчувае страх, яго ўвага рэзка звужаецца, канцэнтруецца на аб'екце ці сітуацыі, якая сведчыць аб нейкай небяспецы. Інтэнсіўны страх стварае эфект «тунэльнага ўспрымання». Гэта значыць, што істотна абмяжоўваецца ўспрыманне, мысленне, свабода выбару дзейнасці і ўчынкаў. Выходзячы з адзначанага можна канстатаваць, што страх складаецца з пэўных і даволі спецыфічных фізіялагічных змен, экспрэсіўных паводзін і спецыфічнага перажывання, якое з'яўляецца вынікам чакання пагрозы.

Такім чынам, страх можна вызначыць як «эмоцыю, якая звязана з пагрозай біялагічнаму ці сацыяльнаму існаванню асобы, што накіравана на крыніцу існуючай ці ўяўляемай бяспекі, і выяўляецца ў значных фізіялагічных змяненнях і накіраванасці на абарону» [3, с. 133].

Аднак неабходна памятаць, што страх нельга назваць увогуле адмоўнай эмоцыяй, якая перашкаджае жыццю чалавека. Страх — гэта неад'емнае звяно ў эвалюцыі чалавецтва, гэта адна з асноўных (базавых) эмоцый, якая дапамагае захаванню здароў'я, дабрабыту, жыцця чалавека. У працэсе развіцця асобы ён адыгрывае абарончую і навучальную ролю, садзейнічае пазнанню навакольнага свету. Таму сацыяльнаму педагогу неабходна ведаць агульныя характарыстыкі існавання страхаў у дзяцей, умець іх дыягнаставаць, вызначаць норму ці адхіленні і ствараць умовы для сацыяльна-педагагічнай карэкцыі эмацыянальнага развіцця асобы.

Асновай для такога напрамку дзейнасці, на наш погляд, з'яўляецца веданне найбольш значных актыватараў страху. Амерыканскі псіхолаг К. Ізард да іх адносіць матывы, эмоцыі і кагнітыўныя працэсы [3].

Матыў — гэта «прымушэнне да дзейнасці, якое звязана з задавальненнем патрэбнасцей суб'екта» [4, с. 219]. Матыў можа набыць псіхалагічнае значэнне тады, калі яго інтэнсіўнасць дасягае крытычнага ўзроўню (напрыклад, калі сігналізуе чалавеку аб вострым фізіялагічным дэфіцыце). У гэтых выпадках матыў актывізуе эмоцыю, і такой эмоцыяй як раз можа быць страх. Таму вельмі важна, каб сацыяльныя педагогі, арганізатары вольнага часу мелі неабходныя навыкі для выяўлення матываў паводзін дзіцяці, дапамагалі яму вырашаць узніклую праблему без узмацнення адчування страху.

Фактарам узнікнення страху К. Ізард называе таксама эмоцыі, якія, паводле прынцыпу эмацыянальнага заражэння, могуць актывізаваць эмоцыю страху [3, с. 219]. Так, рэакцыі ўзбуджанасці, спалоху ў сувязі з падобнасцю іх нейрафізіялагічных механізмаў да механізмаў, якія ляжаць у аснове эмоцыі страху, нярэдка з'яўляюцца стымуламі апошняга.

Самым пашыраным і распаўсюджаным актыватарам страху з'яўляюцца кагнітыўныя (пазнавальныя) працэсы. У гэтым выпадку страх выступае вынікам кагнітыўнай ацэнкі сітуацыі як патэнцыяльна небяспечнай. Так, страх здольныя выклікаць успаміны аб аб'екце ці ўяўляемы вобраз аб'екта. Часта для малодшага школьніка гэта могуць быць казачныя пачвары, кінематаграфічныя вобразы розных страшыдлаў, якія пагражаюць жыццю чалавека, сучасныя мастацкія вобразы тэхнагенных працэсаў і інш. Дзеці малодшага школьнага ўзросту, як і дашкольнікі, нярэдка адчуваюць страх перад злым сабакам, быком, пацуком, змяёй. Часам хлопчыкі і дзяўчынкі сняць тое, што іх пужае. Успаміны аб спалоху, перажытым у працэсе ўспрымання пэўных мастацкіх твораў, здольныя стаць актыватарамі страху. Такім чынам, чалавек, прадмет або сітуацыя здольныя выклікаць у маленькага чалавека эмоцыю страху ў выніку фарміравання гіпотэз (уяўленне крыніц шкоды); чакання шкоды; непасрэднага сутыкнення са сканструяваным (уяўляемым) аб'ектам страху.

У працэсе развіцця псіхікі дзіцяці і ўмоў яго жыцця страх усё больш набывае сацыяльна апасродкаваны характар і выяўляе ўсё больш псіхалагічна тонкую гаму маральна-этычных пачуццяў і перажыванняў. Напрыклад, для малодша-

га школьніка вялікае значэнне набываюць адносіны з калектывам класа ці іншай групай (гурток, студыя мастацкай творчасці і інш.), меркаванні аўтарытэтных дарослых, боязь парушыць агульнапрынятыя нормы, а таксама страх смерці бацькоў. У гэтай сувязі дзіця можа адчуваць страх асаблівага роду: яно баіцца паказацца смешным, баязліўцам, ілгуном і інш. Трэба мець на ўвазе, што ў гэты перыяд назіраецца агульная для большасці дзяцей тэндэнцыя эмацыянальнай нясталасці і занепакоенасці. Гэта з'яўляецца перадумовай узнікнення і замацавання ў псіхіцы дзіцяці страхаў перад рознымі з'явамі жыцця.

Адной з прычын узнікнення страхаў у дзяцей з'яўляецца педагагічная некампетэнтнасць бацькоў. Пра гэта сведчаць існаванне страхаў у саміх бацькоў, галоўным чынам у маці, павышаная трывожнасць у зносінах з дзіцем, празмерная ахова яго ад небяспекі і ізаляцыя ад зносін з аднагодкамі, вялікая колькасць забарон з боку бацькоў або прадастаўленне поўнай свабоды, шматлікія пагрозы (хаця і нерэалізуемыя) дарослых у сям'і, адсутнасць магчымасці для ролевай ідэнтыфікацыі з бацькамі таго ж полу, пераважна ў хлопчыкаў, і інш. [2, с. 84—85].

Як было адзначана, страхі выконваюць і пазітыўную, адаптыўную функцыю. Яны забяспечваюць дзіцяці неабходную падрыхтоўку да сустрэчы з непазнаным. Звычайна ўзроставыя страхі існуюць на працягу трох—чатырох тыдняў (што з'яўляецца нормай). Аднак калі з часам інтэнсіўнасць страху ўзрастае, то можна гаварыць пра адхіленне ад нормы. У псіхалагічнай навуцы вылучаюцца наступныя характарыстыкі такіх гіпертрафіраваных страхаў: вялікая эмацыянальная інтэнсіўнасць, напружанасць і працягласць. Гэтыя страхі могуць існаваць і павялічвацца амаль да дарослага ўзросту, што дрэнна ўплывае на фарміраванне характару, прыводзіць да ўзнікнення рэактыўна-абарончай мадэлі паводзін (пазбяганне аб'екта страху, а таксама ўсяго новага і невядомага). Гэта ў значнай ступені звужае прастору для самарэалізацыі асобы, не дае магчымасці раскрыць яе патэнцыял. Таму своечасовае выяўленне і пераадоленне страхаў дзіцяці з'яўляецца вельмі важнай задачай не толькі псіхолагаў і педагогаў-прадметнікаў, але і сацыяльных педагогаў, якія працуюць у сацыякультурных пазашкольных установах. Арыентацыя дзейнасці сацыяльных педагогаў на выкарыстанне ў развіваючай і карэкцыйнай рабоце розных відаў мастацтва як сродку выхавання асобы дзіцяці дае шырокія магчымасці для беспраблемнага пераадолення страхаў і стварэння аптымальных умоў для гарманічнага развіцця маленькага чалавека.

1. *Бердяев Н.А.* Философия свободы. Смысл творчества. — М.: Правда, 1989.

2. *Захаров А.И.* Что снится нашим детям. — СПб.: Дельта; М.: Издательство АСТ, 1997. — 432 с.

3. *Изард К.Э.* Психология эмоций: Пер. с англ. — СПб.: Питер, 2000. — 464 с.

4. Психология: Словарь / Под общ. ред. А.В. Петровского, М.Г. Ярошевского. — 2-е изд. — М.: Политиздат, 1990.

*Художник делает самое малое — большим.*

*В.В. Вересаев*

*Искусство требует, чтобы ему отдавались целиком. Ради искусства своего народа нужно и необходимо жертвовать всем... Только так является у мира новый художник. Такой художник дарует миру новое слово. Эти слова приводят в движение тысячи лет миллионов сердца.*

*В.И. Качалов*